**А. Г. Цымбал**

# МЯСЦОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ РЭСУРСЫ Ў ПЛАНАХ ГЕРМАНСКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД У БЕЛАРУСІ (1941–1944)

Выкарыстанне працоўных рэсурсаў акупаванай Беларусі з’яўлялася адным з найбольш істотных элементаў палітыкі нямецкіх улад. Пытанні працоўнай штодзённасці і прыцягнення мясцовага насельніцтва да працы акупацыйнымі ўладамі не знаходзілася ў цэнтры ўвагі даследчыкаў. У савецкай гістарыяграфіі праца на акупантаў разглядалася як здрадніцтва, у сучаснай беларускай гістарычнай навуцы яна набыла іншы статус. Больш дэталёвае

і грунтоўнае вывучэнне праблемы сутыкалася з абмежаванасцю базы крыніц. Прадстаўленае даследаванне мае мэтай, у першую чаргу, увядзенне ў навуковы абарот новага фактычнага матэрыялу па праблеме працоўнай штодзённасці і выкарыстання акупацыйнымі ўладамі працы насельніцтва Беларусі ў 1941–1944 гг.

Выключную значнасць для раскрыцця вышэйадзначанай тэмы прадстаўляе Калекцыя дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» (фонд 378 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь). Нямецкамоўная крыніца змяшчае багаты фактычны матэрыял, які датычыцца асобнага прадпрыемства – Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск». Дырэкцыя мела свае філіялы па ўсёй тэрыторыі Беларусі з працуючым нямецкім і мясцовым рабочым персаналам. Калекцыя дакументаў уяўляе сабой значны комплекс крыніц, якія ўключаюць вялікую колькасць паведамленняў статыстычнага характару аб колькасці рабочай сілы з ліку нямецкіх працаўнікоў і мясцовых жыхароў, патрэбе ў персанале падраздзяленняў прадпрыемстваў чыгункі, якія адносяцца да розных гадоў акупацыі, таксама ўтрымлівае звесткі аб ваеннапалонных і яўрэях, што задзейнічаны на работах. Дакументы змяшчаюць разнастайную інфармацыю аб дырэктыўных распараджэннях па арганізацыі працы мясцовых работнікаў, прафесіях, на якія быў найбольшы попыт у акупацыйных улад, галоўных накірунках службы, харчовым забеспячэнні работнікаў, уліку захворванняў мясцовага персаналу, умовах працы, апісваецца праблематыка ўздзеяння партызанскіх фарміраванняў на спробы павышэння якасці выкарыстання працы мясцовага насельніцтва гарадоў і вёсак акупаванай Беларусі.

Германскія акупацыйныя ўлады ў значнай ступені залежалі ад скарыстання працы мясцовага насельніцтва, якое магло забяспечыць функцыянаванне прадпрыемстваў Беларусі. Прыцягненне мясцовага персаналу на прадпрыемствы чыгункі вызначалася шэрагам нямецкіх інструкцый па найме і ўзнагароджанні мясцовай рабочай сілы. Першая з іх пачала дзейнічаць з 25 чэрвеня 1941 г. [1, арк. 3–3 адв., 4–4 адв., 5–5 адв.]. Аналіз дакумента дазваляе зрабіць наступныя высновы. Уладамі вызначалася, што ўсе пасады павінны былі быць размеркаваны паміж мясцовымі працаўнікамі, за выключэннем тых, якія па сур'ёзных прычынах павінны займацца немцамі. Пытанні прыцягнення якаснай рабочай сілы ў дастатковай колькасці заўсёды былі ў цэнтры ўвагі акупацыйнай адміністрацыі. Аб'ёмы найму вызначаліся актуальнай патрэбай. Асобная ўвага звярталася на тое, каб праца работнікаў, прыдатных для чыгункі, не выкарыстоўвалася ў іншых галінах. Абмежаванняў па найму мясцовага персаналу таксама не прадугледжвалася. Такім чынам меркавалася мець запас персаналу і магчымасць скараціць працоўны час.

Перш за ўсё планавалася наймаць мясцовы персанал, ні ў якім разе нельга было прымаць на працу палітычных камісараў, яўрэяў і, як пазначана ў дакуменце, паў-яўрэяў. Служачых, якія займалі пасады раней, можна было наймаць з дазволу палявой дырэкцыі транспарту, працаўнікоў з веданнем

нямецкай мовы трэба было наймаць у першую чаргу. Праводзілася апытанне аб стане здароўя і вызначалася прыдатнасць работніка да працы, пры неабходнасці ажыццяўляўся медыцынскі агляд. Кожны работнік павінен быў уносіцца ў спіс персаналу, дзе пазначаліся наступныя звесткі: бягучы нумар, прозвішча, імя, дата народзінаў, адрас пражывання, апошняя пасада, якую займаў работнік, дата прыёму на працу, від занятку і асаблівыя ўменні (напрыклад, перакладчык), а таксама дзень і прычына звальнення. Для ідэнтыфікацыі служачы атрымліваў павязку на руку і пропуск.

Асобная ўвага ў інструкцыі звярталася на тое, што да кожнага супрацоўніка трэба данесці, што нямецкі вермахт забяспечвае яму дастатковую заработную плату, узамен патрабуе ўкладання сіл у працу і вернасці. З мясцовым персаналам трэба было абыходзіцца строга, але справядліва.

Падкрэслівалася, што самастойнае выкарыстанне працы мясцовых кваліфікаваных спецыялістаў на кіруючых і адказных пасадах першапачаткова не разглядалася. Мясцовы персанал не павінен быў мець права аддаваць загады нямецкім супрацоўнікам чыгункі.

Тым не менш першапачатковыя дырэктывы і інструкцыі не прывялі да, па меркаванні ўлад, задавальняючага ўзроўню працы мясцовых работнікаў. Сітуацыя на фронце, рост уздзеянняў партызанскіх фарміраванняў спрыялі перагляду падыходаў да ўзаемадзеяння акупантаў з мясцовым кваліфікаваным персаналам. Акупацыйныя ўлады ўсё больш задаваліся пытаннямі павышэння прадукцыйнасці працы. З гэтай мэтай, напрыклад, 15 кастрычніка 1942 г. была падрыхтавана аналітычная запіска аб «Мэтанакіраванай сістэме аплаты працы рускіх працоўных і яе ўплыве на прадукцыйнасць і павелічэнне прадукцыйнасці». Аўтар падкрэсліваў неабходнасць улічваць асаблівасці «рускага менталітэту», толькі такім чынам нямецкія кіраўнікі здолеюць выхаваць і сфарміраваць рускіх як прадуктыўных і надзейных працоўных. У выніку «рускія будуць бачыць ў немцах не прыгнятальнікаў і эксплуататараў, а вызваліцеляў з-пад бальшавіцкага гнёту» [2, арк. 31 адв.].

Акрамя заўваг наконт асаблівасцей менталітэту вынікам аналітычнай запіскі стала зацвярджэнне 29 лістапада 1942 г. новай «Інструкцыі аб выкарыстанні і павышэнні прадукцыйнасці працы мясцовай рабочай сілы і ваеннапалонных» [3, арк. 22]. Падыходы да мясцовага насельніцтва істотна змяніліся: працягласць працы неабходна было зрабіць аднолькавай з імперскімі немцамі, а асноўным прынцыпам павінен быў стаць наступны: «Кожны на сваім працоўным месцы». Падкрэслівалася, што працу кваліфікаваных рабочых дазвалялася выкарыстоўваць толькі ў адпаведнасці з іх адукацыяй. Каштоўных нямецкіх спецыялістаў трэба было замяняць іх мясцовымі кваліфікаванымі працаўнікамі. Таму мясцовым кваліфікаваным рабочым забаранялася працаваць на неадпаведных кваліфікацыі работах. Прадугледжвалася павышэнне кваліфікацыі або перападрыхтоўка. Таксама абвяшчаліся прынцыпы эканомнага выкарыстання працы мясцовых работнікаў, забаранялася

іх звальняць, магчыма было толькі перавесці на новыя ўчасткі чыгункі. Існаваў дэфіцыт працаўнікоў, акупацыйныя ўлады адзначалі: «Працоўная сіла з прадукцыйнасцю 30 % лепш, чым ніякая» [3 , арк. 22 адв.].

Адначасова ўводзіліся іншыя формы павышэння прадукцыйнасці працы: дадатковая грашовая падтрымка і сацыяльнае абслугоўванне. Вострай праблемай для акупантаў сталі масавыя ўцёкі рабочых. Вялікая ўвага надавалася падтрыманню дысцыпліны і кантролю.

Працоўны час павінен быў вызначацца вытворчай неабходнасцю. Але акупацыйныя ўлады падкрэслівалі, што не трэба было так моцна выкарыстоўваць працоўную сілу, каб яна хутка аказвалася неэфектыўнай. Размеркаванне выходных таксама адбывалася адпаведна вытворчай патрэбе [1, арк. 3–3 адв., 4–4 адв., 5–5 адв.].

Заяўкі на адпачынак першапачаткова не разглядаліся. У абгрунтаваных выпадках магчыма было атрымаць вызваленне ад працы без аплаты.

Прадугледжвалася сістэма штрафаў у выпадку невыканання службовых абавязкаў. Кіраўнік службы меў права накласці штраф у памеры сярэдняга дзённага заробку. Штраф мог быць павялічаны ў 5 разоў.

Служачы меў права скасаваць свае працоўныя адносіны толькі з дазволу кіраўніка службы. Палявая дырэкцыя транспарту мела права звольніць работніка ў любы момант.

Заработная плата ўяўляла сабой аплату па гадзінах. Час хваробы, прагулы, выхадныя і святы не аплачваліся. Ніякіх надбавак першапачаткова таксама не было. Для вызначэння аплаты працы прадугледжваўся падзел працоўных на 3 групы. Заработная плата групы 1 павінна была адпавядаць звычайнай для мясцовасці сярэдняй заработнай плаце. Заработная плата групы 2 – на 10 % вышэй, 3 – на 20 %. Таксама існавала адпаведная тарыфная сетка.

Да групы 1 адносіліся: неадукаваныя рабочыя (вакзальныя служачыя, прыбіральшчыкі, дзяжурныя па пераездзе); адукаваныя рабочыя (абслуговы персанал чыгуначнага шляху, счэпшчыкі, чысцільшчыкі, пагрузчыкі вугалю, грузчыкі і г.д.); пісары; работнікі такіх прафесій: качагары, манеўровыя дыспетчары, брыгадзіры шляхавай брыгады, багажныя раздатчыкі, кандуктары, шляхавыя абходчыкі, кладаўшчыкі, службовыя памочнікі.

Група 2: рамеснікі; работнікі на пасадах, якія тычацца абслугоўвання імперскай чыгункі; работнікі такіх прафесій: майстры-счэпшчыкі, майстры шляхавых брыгад, майстры-лінейныя наглядчыкі, майстры-пагрузчыкі, майстры-кладаўшчыкі, але толькі ў тым выпадку, калі іх дзейнасць па сваёй значнасці пераўзыходзіць працу счэпшчыкаў, брыгадзіраў шляхавых брыгад, лінейных наглядчыкаў, пагрузчыкаў і кладаўшчыкоў.

Група 3: старшыя рамеснікі; работнікі такіх прафесій: радаўцы, майстры, вагонаважатыя, вагонныя майстры, машыністы, начальнік цягніка; работнікі накшталт тэхнічных і нетэхнічных асістэнтаў, сакратароў (арганізацыя руху і кіраванне) [1, арк. 6, 7].

Велічыня зарплаты залежала ад тарыфных груп згодна з дадаткам да інструкцыі, зацверджаным 5 жніўня 1941 г. Па ўзоры стандартных для мясцовасці велічынь для Мінска вызначаліся наступныя пагадзінныя нормы, якія таксама лічыліся найвышэйшым заробкам у акрузе палявой дырэкцыі транспарту:

тарыфная група 1 – 2 рублі;

тарыфная група 2 – 2,40 рублёў;

тарыфная група 3 – 2,80 рублёў;

тарыфная група 4 – 3,20 рублёў.

У больш дробных паселішчах, асабліва ў сельскай мясцовасці, велічыні вызначаліся прыкладна да паловы вышэй прыведзеных значэнняў [1, арк. 9, 9 адв., 10, 10 адв.].

Сітуацыя змянілася ўжо 29 снежня 1941 г. Была выдадзена новая дырэктыва па ўзнагароджанні мясцовай рабочай сілы ў сферы Галоўнай дырэкцыі чыгункі «Цэнтр» [4, арк. 6–6 адв., 7–7 адв., 8–8 адв., 9–9 адв.]. Адзначалася: штодзённая абавязковая праца павінна складаць не менш за 8 гадзін. Кожны работнік і супрацоўнік павінен быць гатовы да перавышэння гэтай нормы па неабходнасці. Перапрацоўка па магчымасці была ўраўнаважана вольным часам. Калі гэта нельга было зрабіць, яна аплочвалася згодна з наступнымі ўстаноўкамі:

а) пагадзінная і дзённая аплата;

б) пры аплаце за месяц, якая звычайна разлічвалася на 48 гадзін працы ў тыдзень, пры перавышэнні да 54 гадзін даплата не здзяйснялася. Калі агульны час працы перавышаў 54 гадзіны, то за кожную гадзіну вышэй 54 выплачвалася ўзнагароджанне ў памеры 1/200 ад платы за месяц. Ніякіх надбавак па перапрацоўцы не прадугледжвалася, як і асобных надбавак за працу ў выходныя, святы і начную змену.

Парадак выплаты заробку здзяйсняўся адпаведна тарыфным групам у табл. [1, арк. 6–6 адв., 7–7 адв., 8–8 адв., 9–9 адв.].

Т а б л і ц а

Тарыфныя групы па аплаце працы
ў адпаведнасці з дырэктывай ад 29.12.1941 г.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тарыфная група 1 | Неадукаваныя рабочыя, дапаможныя працоўныя пасля 18 гадоў | Пагадзінны аклад – 1,10 рублёў<br>дзённы аклад – 8, 80 рублёў | Работнікі вакзалаў, прыбіральшчыкі, рабочыя-надомнікі, пасыльныя, работнікі сталовых, дзяжурныя, ліфцёры, абслуга лямпаў, работнікі па сумяшчальніцтве на складскіх пляцоўках, работнікі шляхавых дыстанцый на лёгкіх работах, работнікі складскіх памяшканняў на лёгкіх работах, растопшчыкі, разносчыкі ежы, качагары на простых растопных прыладах, прыбіральшчыкі вагонаў, дзяжурныя па чыгуначным пераездам ў простых умовах |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Жанчыны пасля 18 гадоў, якія займаюцца простай працай | Пагадзінны аклад – 0,90 рублёў<br>дзённы аклад – 7,20 рублёў | Прыбіральшчыцы, кухонная прыслуга |
| Тарыфная група 2 | Адукаваныя рабочыя пасля 18 гадоў | Пагадзінны аклад – 1,40 рублёў<br>дзённай аклад – 11,20 рублёў | Абслуговы персанал пуцей, некваліфікаваны рабочы, які абслугоўвае шпалападбівачныя машыны, чысцільшчык стрэлачных перводаў і семафораў, абслуговы персанал тэлеграфа, працоўны дрэвапрапітачнага і шпалазагатоўчага завода, дзяжурны па пераездзе ў цяжкіх умовах, шляхавы абходчык, счэпшчык, укладчык тармазнога вагоннага запавольніка, ўсталёўшчык ручнога стрэлачнага пераводу, работнік складской пляцоўкі, багажны працаўнік, складскі рабочы, абслуговы персанал пад'ёмнага крана, памочнік у станка, станочнік, работнік па здабычы карысных выкапняў, мыйшчык вагонаў, чысцільшчык станкоў і вагонаў, вуглепагрузчык, счэпшчык і змазчык, абслуговы персанал паваротнага круга, дэзынфектар вагонаў з жывёламі, работнік простых падліковых і пісчых службаў, кухаркі |
| Тарыфная група 3 | Старшыя работнікі пасля 18 гадоў | Пагадзінны аклад – 1,60 рублёў<br>дзённы аклад – 12,80 рублёў | Стрэлачнікі цэнтральных пастоў, лінейныя наглядчыкі, кандуктары, багажныя раздатчыкі, дзяжурны па прыбыцці цягнікоў, наглядчык склада, працаўнік на пасадзе, адпаведнай пасадзе эксплуатацыйнага абслуговага персаналу ў імперскай чыгунцы |
| Тарыфная група 4 | Паўнавартасныя рамеснікі ўсіх відаў | Пагадзінны аклад – 1,85 рублёў<br>дзённы аклад – 14,80 рублёў | Паравозныя качагары, памочнік машыніста, начальнік цягніка, манеўровы дыспетчар, брыгадзір пуцёвай брыгады, шафёр, аператар станка, працаўнік на пасадзе, якая ў імперскай чыгунцы адпавядае пасадзе асістэнта |
| Тарыфная група 5 | Старшыя рамеснікі пасля 18 гадоў | Пагадзінны аклад – 2,30 рублёў<br>дзённы аклад – 18, 40 рублёў | Майстар абслугоўвання сігналаў і тэлеграфа, вагонны майстар (кваліфікаваны), працаўнік на пасадзе, адпаведнай пасадзе сакратара ў імперскай чыгунцы |

*Заканчэнне табл.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тарыфная група 6 | Майстры | Пагадзінны аклад – 2,70 рублёў дзённы аклад – 21,60 | Майстры абслугоўвання пуцей і вагона-рамонтных заводаў, машыністы, абслуговы персанал лакаматыва, брыгадзір па пуці, майстар па чыгуначнай аўтаматыцы, тэлемеханікі і сувязі, працаўнік на пасадзе, адпаведнай пасадзе вышэйшага сакратара імперскай чыгункі |
| Тарыфная група 7 | Інспектары | Месячны аклад – 700 рублёў | Работнікі на пасадах, суадносных з пасадамі вопытных інспектараў і вышэйшых інспектараў імперскай чыгункі, калі гэтыя пасады былі ў аналагічных па важнасці супрацоўнікаў яшчэ ў савецкія часы |
| Тарыфная група 8 | Начальнікі | Месячны аклад – 950 рублёў | Работнікі на пасадах, адпаведных пасадам акруговага начальніка і чыноўніка з вышэйшай адукацыяй імперскай чыгункі, калі гэтыя пасады былі ў аналагічных па важнасці супрацоўнікаў яшчэ ў савецкія часы |
| Тарыфная група 9 | Перакладчыкі | У месяц: а) вусныя перакладчыкі – 800 рублёў б) пісьмовыя перакладчыкі – 700 рублёў в) тыя, што ведаюць мову – 350 рублёў | Группа перакладчыкаў: вусныя і пісьмовыя перекладчыкі |

Зрыў планаў маланкавай вайны знайшоў адлюстраванне ў акупацыйнай палітыцы на Беларусі. Улады пачынаюць змяняць ранейшыя інструкцыі адносна мясцовых работнікаў. Ужо з канца 1941 г. уводзіцца здзельная і прэміяльная аплата працы. Асаблівую каштоўнасць набываюць мясцовыя рабочыя, якія валодаюць нямецкай мовай. Таксама згодна з дырэктывай жанчыны павінны былі атрымліваць аднолькавае ўзнагароджанне з мужчынамі. Моладзь ва ўзросце ад 16 да 18 год атрымлівала 80 %, да 16 год – 50 % акладу дарослых. Але ў 1941 г. сацыяльныя выплаты не прадугледжваліся.

Планавалася як магчыма хутчэй забяспечыць харчаваннем рабочых. Але да канца 1941 г. сітуацыя з харчаваннем так і не праяснілася. У дырэктыве ад 29.12.1941 г. значылася, што парадак выдачы харчавання рускаму насельніцтву яшчэ будзе дадаткова вызначаны ў далейшым. Прадукты павінны былі выдавацца толькі за грошы. Кошт вылічваўся з акладу ў наступным памеры:

а) дзённае забеспячэнне – 6 рублёў;

б) частковае забеспячэнне, абед – 3 рублі; сняданак, вячэра – кожны 1,50 рублёў;

в) паходны паёк – 4 рублі.

2 снежня 1942 г. акупацыйная адміністрацыя чыгункі ўжо планавала ўвесці спецыяльнае харчаванне для занятых на асабліва цяжкіх работах, куды ўваходзілі:

1) персанал лакаматыва;

2) праваднікі цягнікоў;

3) манеўровы персанал,

4) стрэлачнікі;

5) персанал па бягучаму забеспячэнню чыгункі;

6) персанал лакаматыўнага дэпо;

7) персанал цэхаў вагонарамонтнага завода [5, арк. 48].

Наяўныя матэрыялы крыніц Калекцыі дакументаў галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» падаюць дастаткова фрагментарную інфармацыю адносна праблемы выкарыстання працы мясцовага насельніцтва на прадпрыемствах акупаванай Беларусі. Велізарны факталагічны масіў з цяжкасцю падаецца абагульненню і генералізацыі, але дазваляе зрабіць пэўныя вывады, якія маюць у тым ліку і канцэптуальны характар. Акупацыйныя нямецкія ўлады надавалі вялікую значнасць пытанню лаяльнасці насельніцтва Беларусі. З гэтай мэтай распрацоўваліся дырэктыўныя дакументы, інструкцыі, цыркуляры, аналізаваліся настроі і працоўны патэнцыял мясцовых работнікаў. Кіраўніцтва акупаванай Беларусі выкарыстоўвала адпаведныя метады і разумела, што германскія праграмы будаўніцтва на Усходзе, як і сама перамога ў вайне, у значнай ступені залежаць ад падтрымкі мясцовага насельніцтва. Першапачатковыя намеры выключна жорсткага і амаль бяспраўнага выкарыстання працы мясцовых работнікаў хутка сутыкнуліся з рэчаіснасцю. У выніку акупацыйная адміністрацыя звяртаецца да іншых сродкаў заахвочвання і павышэння прадукцыйнасці працы мясцовых работнікаў. Акрамя рэпрэсіўнага ўздзеяння і арганізацыі сістэмы кантролю ставіліся пытанні забеспячэння мясцовых работнікаў чыгункі прадуктамі, стварэння пэўных сацыяльных гарантый, праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на павелічэнне прадукцыйнасці працы мясцовых жыхароў і яе стымуляванне – надбаўкі да заработнай платы, прэміяльныя і здзельная аплата працы, узнагароджанні, прэміі, выдача прадуктаў, далікатэсаў, дабрачынная дзейнасць і дапамога сем'ям супрацоўнікаў.

Дакументы Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» змяшчаюць унікальную інфармацыю, якая дазваляе істотна пашырыць фактаграфічную базу даследаванняў гісторыі перыяду акупацыі Беларусі. Увядзенне ў выніку праведзенага даследавання новага велізарнага факталагічнага масіву ў гістарычную навуку спрыяе разгляду тэарэтычных пытанняў адносна метадалагічных падыходаў і навуковых схем аналізу акупацыйнага перыяду. Выкарыстоўваючы ўведзеныя ў навуковы абарот крыніцы, а таксама сучасныя метадалагічныя падыходы, варта аналізаваць стратэгіі выжывання насельніцтва Беларусі ва ўмовах акупацыі. Інфармацыя з крыніц Калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» садзейнічае пастаноўцы даследчыкамі пытанняў аб умовах выжывання мясцовых работнікаў на другіх прадпрыемствах, у іншых сферах працы і рэгіёнах акупаваных тэрыторый Беларусі.

ЛІТАТАРУРА

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). – НАРБ. – Фонд 378. – Воп. 1. – Спр. 48.
2. НАРБ. – Фонд 378. – Воп. 1. – Спр. 326.
3. НАРБ. – Фонд 378. – Воп. 1. – Спр. 307.
4. НАРБ. – Фонд 378. – Воп. 1. – Спр. 43.
5. НАРБ. – Фонд 378. – Воп. 1. – Спр. 312.